Убийство в прямом эфире

Стар. 2

Прыгавор без змяненняў

Стар. 7

эфэктыўнасьць прадпрыемстваў праверацць ідэолягі

Стар. 8

№22

ЛЮТЫ 2008

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

**МАГІЛЁЎСКАЯ АБЛАСНАЯ КААЛІЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛАЎ ВЫКАЗВАЕ ШЧЫРЫЯ СПАЧУВАНЬНІ СЯМ'І КАЗУЛІНЫХ, РОДНЫМ І СЯБРАМ ПАМЕРЛАЙ. ЗЫЧЫМ АЛЯКСАНДРУ КАЗУЛІНУ МУЖНАСЬЦІ І ВОЛІ.**

## Памерла Ірына Казуліна



Увечары 23 лютага на 49-м годзе жыцьця памерла Ірына Казуліна, жонка зьняволенага палітыка, былога кандыдата на пасаду прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Казуліна.

“Гэта адбылося пасьля 20-й гадзіны. Маме зрабілася дрэнна, і мы сабралі яе, каб везьці ў шпіталь. Па дарозе яна страціла прытомнасьць. Калі прывезьлі, дактары сказалі, што яна ўжо памерла”, - сказала “Свабодзе” старэйшая дачка Ірыны Казулінай Вольга.

З канца 1990-х гадоў Ірына Казуліна хварэла на рак малочнай залозы. Апрача мужа Аляксандра, у Ірыны Казулінай засталіся дочкі Вольга і Юлія, а таксама ўнук Улад.

Да апошняга Ірына Казуліна вяла актыўнае грамадзкае жыцьцё, змагалася за вызваленьне свайго мужа і дэмакратызацыю Беларусі. Ірына не хавала, што цяжка хварэе і шмат рабіла, каб дамапагчы жанчынам, якіх напаткала такая ж бяда. Яшчэ год таму намаганьнямі Ірыны Казулінай у Менску прайшла міжнародная канфэрэнцыя па дапамозе жанчынам, хворым на рак малочнай залозы. Каб канфэрэнцыя не сарвалася, Ірына, кантактуючы з афіцыйнымі асобамі, не называла свайго прозьвішча…

Ірына Казуліна амаль два гады чакала вызваленьня свайго мужа, Аляксандра Казуліна, з турмы. Не дачакалася.

Радыё “Свабода” выказвае спачуваньні сям'і Казуліных, усім сваякам і блізкім памерлай.

*Радыё Свабода*



### КОЗУЛИНУ СООБЩИЛИ О СМЕРТИ СУПРУГИ ТОЛЬКО НА СЛЕДУЮЩИЙ ДЕНЬ

О смерти жены Александра Козулина проинформировал начальник колонии «Витьба-3» Виталий Агнистиков.

В интервью БелаПАН В.Агнистиков сообщил: «Сразу после подъема, в 7 утра, я лично сообщил Александру Козулину о смерти жены, и мы с ним проговорили полтора часа. Козулин очень тяжело воспринял это известие, видно, что он очень переживает. Однако я не смог ничего определенного сообщить ему том, будет ли он отпущен на похороны».

Начальник колонии утверждает, что соответствующее решение должно быть принято прокурором и департаментом исполнения наказаний МВД. По словам В.Агнистикова, о сроках принятия такого решения ему ничего не известно, но он ожидает распоряжения из Минска в любой момент.

В.Агнистиков отметил, что подобных случаев — когда заключенных временно отпускали из колонии на похороны близких родственников — в его практике пока не было. Поэтому сказать, каким именно образом будет происходить этапирование Козулина в Минск в случае принятия соответствующего решения, он не может.

*Хартия-97*

# Убийство в прямом эфире

Я не знаю, о чем он теперь будет рассказывать нам по телевизору. Но что бы ни нес с экрана, от причастности к смерти Ирины Козулиной ему не отмазаться.

И пусть медики посчитают ее смерть естественной – мы с вами видели это медленное убийство. Ирину Козулину убивали не тайно, а в режиме реального времени на глазах у десяти миллионов человек. И не одним ударом ножа, а медленно, с наслаждением маньяка, два года подряд. Ее мужа в это время заперли в замкнутом пространстве, оставив в стене дырку телеэкрана, и велели: смотри, Козулин, смотри и запоминай. Будьте уверены: он запомнит.

Убийства Захаренко, Гончара, Красовского, Завадского совершались тихо, без следов. А если следы оставались, это ничего ни для кого не значило. Нашли следы крови на месте исчезновения Гончара, установили, что кровь принадлежит пропавшему – да и приостановили следствие, потому что больше ничего выяснить не смогли. Или не захотели. Или не велено было. Но официально убийств как будто не было, потому что не было трупов. Зато было пространство для фантазий. И Лукашенко с удовольствием рассказывал – журналистам, чиновникам, трудящимся или просто себе самому, глядя в камеру, - о том, что Захаренко недавно видели в Германии, а Гончара – в Акапулько. Или в Майами. Или в Биаррице. И всегда находились те, кто в это верил. Некоторые воспринимали это вранье с надеждой: а может, они и в самом деле живы и за границей, и с ними все в порядке, и как бы хотелось, чтобы так оно и было...

Но с Ириной Козулиной все было по-другому. И если Лукашенко попытается, как всегда, изумленно захлопать глазами, развести руками и заявить, что понятия не имел о ее болезни, - ему уже никто не поверит. Потому что всего за неделю до смерти Ирины он сдуру спалился. И зачем-то признался всей стране, что прекрасно знает о ее тяжелой болезни, и пытался этой болезнью воспользоваться, как дымовой шашкой, чтобы выкурить Александра Козулина из страны, и просовывал сводки о состоянии здоровья Ирины сквозь решетку камеры, и дразнил: читай, читай, ей стало хуже, она уже не выкарабкается, что же ты тут расселся, давай, вали за бугор, там и попрощаетесь, только чтоб



больше не возвращался! И этот свой хитроумный план рассказывал всей стране, и выдавал толпе тут же сочиненные скабрезные подробности:

“Насколько утром я был информирован, он отказался ее лечить. Но это семейные проблемы, отказался так отказался. Что нужно от меня, я предложил, но он отказался даже после того, как его дочери поехали и уговаривали спасти маму. А ему эта мама уже давно не надо…»

Почему Лукашенко все время пытается согласовывать слово «надо» с существительными женского рода, не может понять никто. Когда-то он говорил «нам демократия надо, когда человек работает», теперь – «мама уже давно не надо». Вероятно, он думает, что «надо» - это глагол, который спрягается. Или прилагательное, которое имеет и форму женского рода. Но пусть за это будет стыдно его школьным учителям. Остальным плевать, как он говорит, и проблема не в форме, а в том самом содержании. Такие речи допустимы разве что на деревенской завалинке после многих литров самогона. Но и там, если на тему чужих семейных проблем начнет высказываться бобыль, который уже почти пятнадцать лет живет без семьи, - засмеют. А если этот бобыль попытается поиздеваться над больным человеком – за такую болтовню будут просто бить в морду.

В прошлый понедельник, когда Ольгу Козулину задержали с плакатом «Свободу Козулину!» на площади, ее быстро отпустили и даже не составили протокол о задержании. Менты тоже смотрят телевизор. Может, даже им стало стыдно за это шипение в эфире. Стыдно и противно, как будто экран не разделяет пространство, и слюни, шипение, зависть, смрад летят прямо в лицо.

Больных жалеют и оберегают от лишних переживаний. В их присутствии не обсуждают смертельную болезнь. У них не спрашивают: «И сколько тебе осталось, что врачи говорят?» Об их недугах не рассказывают по телевизору без их согласия. О них не врут, их семьи не унижают публично, у них не отбирают близких, потому что только близкие могут продлить жизнь, отогнать болезнь – пусть не навсегда, пусть на время. Только близкие могут шептать ночью «жить без тебя не могу», только они могут поправлять подушку и тихо плакать рядом, не представляя жизни потом, в одиночестве, и продлевать угасающую жизнь, потому что нельзя уйти так просто, сначала нужно успокоить.

Александр Козулин смог бы продлить жизнь Ирины, они не отпускали бы друг друга, когда надвигается тьма, не смирялись бы, не поддались бы на уговоры смерти, не дались бы ей сонными, оказались бы сильнее этой твари. Но он не смог больше, чем знать все, метаться по промозглой камере и мечтать о том, как вернется к Ирине, и она будет еще жива, и, может быть, потом будет душное лето, будто в юности.

Ничего не сбылось. Теперь они идут по разным улицам и живут в разных городах. Город Александра обнесен колючей проволокой, там ночь, и тьма и мат вертухаев. А Ирина перешла из тела в память и идет по городу, доброму, как колыбельная, и на улицах с ней здороваются и мать Тереза, и Кароль Войтыла, и Януш Корчак. В том городе принято быть великодушными и прощать, а в городе Козулина – помнить и мстить.

Козулин, конечно, отомстит. А Ирина, наверное, простит. Вот только о ее прощении Лукашенко не узнает, потому что никогда не попадет в тот город после смерти. С ним все будет по-другому: две лопаты навоза и ржавая ограда. И память разве что тех, кому задолжал - да не расплатился по счетам.

*Ирина Халип*

ЗА СВАБОДУ

## СВАБОДУ АЛЯКСАНДРУ КАЗУЛІНУ!

Несправядлівае і незаконнае ўтрыманне Аляксандра Казуліна за кратамі – гэта выклік прынцыпам маралі і гуманнасці.

Аляксандр Казулін павінен быць апраўданы і безагаворкава вызвалены.

Заклікаю грамадзянаў Беларусі і міжнародную супольнасць аб'яднаць свой пратэст супраць далейшага ўтрымання вязня сумлення Аляксандра Казуліна ў турме і выкарыстаць усе магчымыя сродкі для таго, каб ён неадкладна выйшаў на свабоду і змог правесці ў апошні шлях сваю жонку.

*Аляксандр Мілінкевіч*

## А.МІЛІНКЕВІЧ: "АЦЭНКА ГЭТАЙ УЛАДЗЕ ТОЛЬКІ АДНА..."

Аляксандар Мілінкевіч у 2006 годзе разам з Аляксандрам Казуліным афіцыйна ўдзельнічаў у прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі. І вось як спадар Мілінкевіч рэагуе на дзеяньні беларускай улады, якая дагэтуль не дае магчымасьці былому кандыдату ў прэзыдэнты Аляксандру Казуліну разьвітацца зь нябожчыцай жонкай:

"Я лічу, што проста амаральна пераўтвараць сьмерць такога чалавека, як Ірына — такога цудоўнага, сьветлага — у палітычную справу. Гэта звычайны людзкі абавязак улады — даць магчымасьць мужу, які знаходзіцца ў зьняволеньні, прайсьці апошні шлях з жонкай перад пахаваньнем. І калі ўлада гэтага ня зробіць, я ўпэўнены, ацэнка ёй можа быць толькі адна — што гэта ўлада бесчалавечная і амаральная".

*Уладзімер Глод*

## СПАЧУВАННІ РОДНЫМ ІРЫНЫ КАЗУЛІНАЙ

Аляксандр Мілінкевіч выказвае спачуванні Аляксандру Казуліну і усім родным Ірыны Казулінай.

Нас заўчасна пакінула вельмі светлы чалавек і надзвычай мужная жанчына. Ірына Казуліна выпраменьвала шчырасць і дабрыню, моц духу і веру. Гэта вялікая страта для нас усіх. Выказваю мае самыя глыбокія спачуванні Аляксандру Уладзіслававічу і ўсім родным і блізкім Ірыны Казулінай.

*Аляксандр Мілінкевіч*

## ПІКЕТ САЛІДАРНАСЬЦІ З КАЗУЛІНЫМІ Ў ВАРШАВЕ

У Варшаве каля амбасады Беларусі быў наладжаны пікет з нагоды смутку па Ірыне Казулінай.

У руках удзельнікаў былі партрэты і здымкі памерлай ў жалобнай рамцы, кветкі і свечкі. Трымалі таксама партрэты А. Казуліна і плакаты з патрабаваньнем аб вызваленьня палітычных вязьняў у Беларусі.

Удзельнікі пікету выказалі патрабаваньні неадкладнага вызваленьня Аляксандра Казуліна з-за кратаў.

## АКЦЫЯ САЛІДАРНАСЬЦІ З А.КАЗУЛІНЫМ У БРУСЭЛІ

25 лютага насупраць беларускай амбасады ў Брусэлі адбылася караткачасовая акцыя салідарнасьці са зьняволеным Аляксандрам Казуліным, які распачаў галадоўку на знак пратэсту супраць злачынных дзеяньняў беларускіх уладаў, якія адмовіліся яго вызваліць для пахаваньня жонкі Ірыны Казулінай.

Брусэльская паліцыя паведаміла супрацоўнікам беларускай амбасады, што ў выніку, калі А.Казулін ня будзе тэрмінова вызвалены, акцыя пратэсту будзе працягнута 26 лютага.

## МІЛІЦЫЯНТЫ САРВАЛІ ЖАЛОБНУЮ АКЦЫЮ Ў ВІЦЕБСКУ

Некалькі мясцовых актывістаў — прадстаўнікоў розных палітычных партый — выйшлі са сьвечкамі і партрэтамі Ірыны Казулінай на вуліцу Леніна ў раёне Летняга амфітэатру.

Мінакі адразу зьвярнулі ўвагу на групу дэманстрантаў. Празь пяць хвілін зьявіліся й супрацоўнікі Кастрычніцкага райаддзелу міліцыі, прычым міліцыянтаў было прыкметна больш, чым удзельнікаў акцыі.

Намесьнік начальніка Кастрычніцкага РАУСу маёр Аляксандар Каліноўскі папярэдзіў прысутных пра адміністрацыйную адказнасьць за арганізацыю несанкцыянаванага мерапрыемства. Удзельнікаў акцыі разам і паасобку міліцыянты здымалі на дзьве відэакамеры.

Партыйцам давялося разысьціся, калі супрацоўнікі міліцыі пачалі сьціскаць іх у кола. Тацяна Севярынец і Алена Баршчэўская яшчэ пэўны час ішлі па вуліцы з запаленымі сьвечкамі й партрэтамі Ірыны Казулінай у руках.

*Радыё Свабода*

## ДОЧКІ КАЗУЛІНА І ЯГО СЯБРЫ ПАЧАЛІ ГАЛАДОЎКУ

Вольга і Юля Казуліны, сябры БСДП(Грамада) Ігар Рынкевіч, Сяргей Скрабец і Алег Воўчак аб'явілі пра пачатак галадоўкі пратэсту.

Пра гэта "Радыё Свабода" паведаміў былы адвакат Ігар Рынкевіч.

"Толькі што я размаўляў з Юляй Казулінай па тэлефоне і атрымаў ад яе пацьверджаньне, што Юля і яе старэйшая сястра Вольга пачалі бестэрміновую галадоўку пратэсту супраць таго, што іх бацьку не пускаюць на пахаваньне маці. Я, Сяргей Скрабец, Алег Воўчак таксама далучаемся да гэтай галадоўкі і просім людзей падтрымліваць законнае патрабаваньне Аляксандра Казуліна прысутнічаць на пахаваньні сваёй жонкі", -- сказаў Ігар Рынкевіч.

## КРЫМІНАЛЬНА-ВЫКАНАЎЧЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 92. Выезды асуджаных да пазбаўлення волі за межы папраўчых установаў

1. Асуджаным да пазбаўлення волі, якія утрымліваюцца ў папраўчых калёніях для асобаў, што ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і прапраўчых калёніях для асобаў, што раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, ва ўмовах агульнага рэжыму, папраўчых калёніях- пасяленьнях і выхаваўчых калёніях, а таксама асуджаным, пакінутым вы ўстаноўленым парадку ў сьледчых ізалятарах для выкананьня працаў па гаспадарчым абслугоўваньні могуць быць дазволеныя кароткатэрміновыя выезды за межы папраўчых і выхаваўчых установаў працягласьцю да сямі сутак, ня лічачы часу, неабходнага для праезду туды і назад, у сувязі з выключнымі абставінамі, пазначанымі у частцы пятай артыкулу 59 гэтага Кодэксу, а таксама для папярэдняга вырашэньня пытаньняў працоўнага і бытавога уладкаваньня пасьля вызваленьня

6. Дазвол на кароткатэрміновы выезд даецца начальнікам папраўчай установы па ўзгадненьні з пракурорам з улікам характару і цяжкасьці зробленага злачынства, асобы і паводзінаў асуджанага.

Артыкул 59. Парадак і умовы выкананьня пакараньня ў выглядзе арышту

5. Пры выключных абставінах (сьмерць ці цяжкая хвароба блізкага родзіча, якая пагражае яго жыцьцю, стыхійнае бедзтва, якое нанесла вялікую матэрыяльную шкоду асуджанаму ці яго сямьі) асуджаным да арышту рашэньнем начальніка арэстнага дому можа быць дазволеная тэлефоная размова працягласьцю да 15 хвілінаў з блізкімі родзічамі з аплатай з уласных сродкаў асуджанага.

# АЛЕКСАНДР КОЗУЛИН НА СВОБОДЕ

Как стало известно пресс-центру Хартии'97, 26 февраля в 01 час ночи был освобожден из колонии на трое суток, специально для участия в похоронах жены, политзаключенный, экс-кандидат в президенты Беларуси Александр Козулин. Международное сообщество призывает белорусские власти окончательно освободить Александра Козулина. Освобождение всех политзаключенных – главное условие нормализации отношений официального Минска с Евросоюзом и США.

Бывший адвокат и соратник политзаключенного Игорь Рынкевич сообщил пресс-центру Хартии'97, что Козулина привез сегодня ночью на автомобиле прямо из колонии домой на улицу Сторожевскую в Минске начальник колонии «Витьба-3» Виталий Агнистиков.

Супруга политзаключенного Ирина Козулина скончалась 23 февраля. 48-летняя женщина страдала от онкологического заболевания. В связи с тем, что власти не сразу освободили политзаключенного проститься с супругой, Александр Козулин объявил голодовку. 25 февраля к голодовке протеста присоединились дочери оппозиционного политика. Вчера в центре Минска также прошла акция памяти Ирины Козулиной и с требованием освободить политзаключенного Александра Козулина.

Освободить Александра Козулина требуют Евросоюз и США. Без освобождения всех политзаключенных официальному Минску не удастся наладить отношения с Европой. С требованием освободить Козулина выступили Еврокомиссия, ПА ОБСЕ, ПАСЕ, Европарламент, посольства США, Франции и Словакии.

## Н. МАШЭРАВА: "АДСУТНАСЬЦЬ МІЛАСЭРНАСЬЦІ – САМЫ ВЯЛІКІ ГРЭХ"

Афіцыйныя асобы вельмі неахвотна камэнтуюць сытуацыю – чаму Аляксандра Казуліна не адпускаюць на пахаваньне жонкі? І наколькі гэта маральна?

Намесьнік старшыні парлямэнцкай камісіі ў міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Анатоль Красуцкі шчыра верыць нядаўнім заявам Аляксандра Лукашэнкі, што Аляксандар Казулін, маўляў, адмовіўся ад прапановы павезьці жонку на лячэньне за мяжу:

"Па-чалавечы я магу толькі спачуваць, што гэта адбылося. Магчыма, нейкія варыянты яе лячэньня маглі быць, калі было садзейнічаньне зь яго боку. Магчымасьць жа была па лячэньні. Калі б ён быў бліжэй, штосьці можа і разгарнуў актыўней. Мне незразумелыя ягоныя матывы ў дадзенай сытуацыі. Пры усім веданьні гэтага чалавека, для мяне важней было б жыцьцё блізкага, а не палітыка. Я, прынамсі, гэты крок не ўхваліў зь ягонага боку. Думаю, што ў пэўнай ступені ёсьць пэўная доля і ягонай віны ў гэтым".

А вось намесьнік старшыні камісіі ў ахове здароўя, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Мікалай Дубовік ветліва адмовіўся ад камэнтару:

"Нават ня ведаю, што вам сказаць... Ведаеце, я не магу адказаць вам. Я прашу прабачэньня. Алё, выбачайце, выключыце дыктафон. Я прашу прабачэньня..."

Дэпутатка Палаты прадстаўнікоў мінулага скліканьня Натальля Машэрава пра дзеяньні беларускіх уладаў адносна сям'і

Адсутнасьць міласэрнасьці – гэта самы вялікі грэх

Казуліных выказалася такім чынам:

"Гэта звышамаральна і нават страшна. Гэта такая ступень амаральнасьці, калі сапраўды робіцца страшна. Страшна ў нейкім вялікім, касьмічным маштабе. Адсутнасьць міласэрнасьці – гэта самы вялікі грэх, і гэта тое, што будзе пакарана звыш, не залежна ад нашай волі".

*Іна Студзінская*

## ОБЩЕЕВРОПЕЙСКАЯ АКЦИЯ В ПОДДЕРЖКУ КОЗУЛИНА

В крупнейшем польском ежедневнике «Gazeta Wyborcza» появилась статья об общеевропейской акции в поддержку Александра Козулина.

Организаторами выступили международная организация «Amnesty International» и гражданская инициатива «Wolna Bialorus». Участникам предлагается подписаться под обращением к Александру Лукашенко, с требованием освободить А.В. Козулина.

«Смерть близкого человека - это драма, которая не совместима с политическими категориями, а шантаж и попытки принуждения к каким-то политическим декларациям мы считаем унижением человеческого достоинства», - говорится в открытом письме. В числе первых подписантов всемирно известные общественные деятели и правозащитники Сергей Ковалев, Адам Михник, Мирослав Маринович, лидер восстания в варшавском гетто Марек Эдельман и многие другие. «Только одно может частично искупить громадные потери, которые он <Козулин - прим. ред.> понес за время вашего правления - это безусловное освобождение и прекращение издевательств и репрессий над Александром Козулиным», - заявляют авторы письма.

Подписаться под обращением можно также в Интернете на сайте www.wolnabialorus.pl/glowna.php. Полный текст обращения на польском языке вы можете прочитать по адресу http://www.gazetawyborcza.pl/1,75477,4970614.html

## ТЫСЯЧИ ЛЮДЕЙ ПРОВОДИЛИ ИРИНУ КОЗУЛИНУ В ПОСЛЕДНИЙ ПУТЬ

В Минске прошла церемония прощания с супругой экс-кандидата в президенты Ириной Козулиной. В заупокойной мессе в Красном костеле приняли участие около 2000 человек. Проститься с Ириной Козулиной пришла вся страна: известные писатели, художники, композиторы и режиссеры, лидеры оппозиционных партий и общественных организаций, представители молодежных движений, дипломаты иностранных государств и простые граждане.

К гробу с телом Ирины Козулиной было возложено огромное количество цветов и венков в национальных бело-красно-белых тонах. Люди не скрывали своей скорби, многие плакали и выказывали сочувствие близким – дочерям Ольге и Юлии и супругу, политзаключенному Александру Козулину, отпущенному властями лишь на три дня для участия в похоронах на требование белорусской общественности и международного сообщества.

Церемония прощания проходила в Красном костеле с 20 часов 26 февраля до 12 часов 27 февраля. После этого в храме прошла заупокойная месса, которую отслужил ксендз Владислав Завальнюк.

# Аляксандар Казулін атрымаў тры дні волі

А першай гадзіне ночы дамоў у Менск з калёніі "Віцьба-3" прывезьлі Аляксандра Казуліна. Палітвязьня не вызвалілі, а толькі далі троxдзённы адпачынак на час пахаваньня яго жонкі Ірыны, якая памерла 23-га лютага.

Праз гадзіну журналісты "Радыё Свабода" убачыліся з Аляксандрам Казуліным у ягонай кватэры, дзе стаяць партрэты Ірыны з чорнымі жалобнымі стужкамі. У момант сустрэчы былы кандыдат на прэзыдэнта даваў інтэрвію па тэлефоне.

Аляксандар Казулін з дочкамі Юляй і Вольгай дома

Запомніліся першыя словы, пачутыя ад Казуліна:

"Бывалі дні, калі я атрымліваў па 200 лістоў. Але як не дзіўна, большасьць зь іх была зь іншых краінаў сьвету. Беларусам яшчэ трэба будзе прачнуцца".

"Падпісваюся толькі "незаконна асуджаны А.Казулін"

У Менск Аляксандра Казуліна прывёз на звычайных "Жыгулях" начальнік калёніі Віталь Агнісьцікаў.

Яшчэ ўчора гэты ж міліцыянт заявіў журналістам, што рыхтуе адмову ў водпуску Казуліну, паколькі той "меў чатыры дысцыплінарныя спагнаньні".

Позна ўвечары ён ужо паказваў былому кандыдату на прэзыдэнта свой загад пра водпуск.

"Вы не ўяўляеце, што тады адбывалася ў калёніі, -- згадвае Аляксандар Казулін.— Калёнія была ачэплена АМАПам, унутры паўсюль ахова, перасоўваньні былі забароненыя".

Аляксандар Казулін апавёў, як даведаўся пра сьмерць жонкі.

24-га раніцай Віталь Агнісьцікаў выклікаў яго да сябе у кабінэт і паказаў тэлеграму. Днём раней Аляксандар Казулін прасіў даць яму тэлефон, каб пазваніць дамоў, але тэлефону "не знайшлі". І вось ён адчуў жудасны боль, што нават не змог яшчэ раз сказаць Ірыне слова падтрымкі.

"Я сказаў: "Усё! Мяне стрымлівала хвароба жонкі, зараз нішто не стрымлівае" і адразу абвясьціў галадоўку. Сарваў з сябе ўсе турэмныя нашыўкі і абвясьціў, што больш іх парадкам не падпарадкоўваюся. Тады ж напісаў заяву пра галадоўку на 4-ох старонках, дзе усё патлумачыў: і пра незаконны арышт, і пра неабходнасьць паехаць на пахаваньне Ірыны."

Віталь Агнісьцікаў у канцы дня скажа журналістам, што ён нічога не чуў пра галадоўку, а 25-га лютага з калёніі прыйдзе афіцыйная інфармацыя і пра тое, што нібыта "Казулін не напісаў заявы пра адпачынак".

"Гэта звычайная хлусьня. Я пра ўсё напісаў у заяве і падпісаў, як звычайна падпісваюся: "незаконна асуджаны А.Казулін".

***Алег Грузьдзіловіч, Алесь Дашчынскі***

# "Маё сэрца разрываецца па Ірыне"

ІНТЭРВІЮ
ДЛЯ РАДЫЁ СВАБОДА

Аляксандар Казулін мяркуе, што ягоную жонку Ірыну "падштурхнула да апошняй рысы ўлада".

Спачатку тым, што незаконна арыштавалі і асудзілі яго як кандыдата на прэзыдэнта ў 2006-ым годзе.

"Аляксандар Лукашэнка добра ведаў, што яна ўжо тады была хворая", -- згадвае спадар Казулін. На яго думку, Ірына, застаўшыся безь яго, "страціла на перажываньні сілы, якія былі патрэбны для барацьбы з хваробай".

Апошняй кропляй, паводле Аляксандра Казуліна, быў "гандаль", пра які Аляксандар Лукашэнка сказаў тыдзень таму ў Віцебску. Калі ўмовай вызваленьня і сустрэчы з чалавекам, у якога рак чацьвёртай стадыі, паставілі тэрміновы выезд абодвух за мяжу.

"Калі б я папрасіў тады мяне азалаціць, азалацілі б, толькі каб выштурхнуць зь Беларусі", - мяркуе Аляксандар Казулін. На гэтыя ўмовы Аляксандар й Ірына не пагадзіліся. Платай стала тое, што яны ўжо ніколі не пабачацца.

"У мяне ад гэтага разрываецца сэрца", -- кажа Казулін.

"Я за кратамі больш вольны, чым шмат хто на волі"

Сёньняшнюю Беларусь Аляксандр Казулін параўноўвае з калёніяй.

"Толькі гэта калёнія сучасная, мадэрнізаваная, дзе правяць тыя, хто сам вінаваты ў злачынствах". Трэцяя частка лістоў на волю і з волі да адрасатаў не даходзіць. Большасьць скаргаў на незаконныя прысуды і дзеяньні адміністрацыі застаюцца там жа, ў турме. За кратамі шмат ахвяраў міліцэйскіх ці пракурорскіх прыпісак, кампаній, экспэрымэнтаў. "Справакавалі гаспадара прадаць некалькі галовак маку, а потым пасадзілі на 6 гадоў", -- адна з турэмных гісторый, сустрэтых Казуліным у "Віцьбе-3".

Паводле Аляксандра Казуліна яму, як кандыдату на прэзыдэнта, карысна было вывучыць і той бок жыцьця, які адкрываецца за кратамі.

"Заяўляю: трэба перагледзець дзесяткі тысяч такіх вось сфальшаваных крымінальных спраў", -- кажа Аляксандар Казулін. Ён мяркуе, што ёсьць прамая сувязь паміж турэмнымі парадкамі ў Беларусі і тым фактам, што у свой час Аляксандар Лукашэнка працаваў у адміністрацыі адной зь беларускіх калёній.

Ці прыстасаваўся Аляксандар Казулін да турэмных парадкаў?

Пра сябе ён кажа, што застаўся вольным чалавекам. Прайшоў пакараньні, галадоўку, ізалятар, яго абмяжоўваюць у кантактах зь іншымі вязьнямі, але ён не здаецца.

"Ніякага памілаваньня падпісваць ніколі ня буду", -- цьвердзіць Аляксандар Казулін і сам пераходзіць ў атаку:

"За гэтыя тры дні падам на Аляксандра Лукашэнку ў суд за маральныя пакуты маёй жонцы Ірыне".

Таксама палітвязень папярэджвае, што працягне ў калёніі галадоўку.

"Буду далей галадаваць і патрабаваць ня толькі свайго вызваленьня, але і вызваленьня Андрэя Кіма. Ён, дарэчы, шмат пісаў мне ў калёнію, завочна мы добра знаёмы", -- кажа Аляксандар Казулін.

Прачнулася сумленьне?

Чаму ўлады пайшлі хаця б на часовае вызваленьне Аляксандра Казуліна?

Аляксандар Казулін пэўна кажа пра адно:

"Калі пабачылі, што болей за тысячу чалавек, пры небясьпецы гвалту, прыйшлі на плошчу і да Чырвонага касьцёлу, са сьвечкамі ў памяць пра Ірыну, то пабаяліся, што зноў выйдуць тысячы, як два гады таму на Дзень Волі. Дзякуй усім гэтым людзям. Сьветлае заўсёды перамагае."

ДРЫБІН

## АД КАДЗІЛА ЗАГАРЭЛАСЯ ЦАРКВА

Ад пажару пацярпеў Свята Троіцкі храм у вёсцы Расна Дрыбінскага раёна. Пасля заканчэння суботняй дзённай службы прыхаджане разышліся, але праз пэўны час убачылі дым над дахам.

Паводле паведамлення Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, агонь пашкодзіў страху. Таксама пацярпела ўнутранае ўбранне і царкоўныя прылады: усё было чорнае ад дыму і копаці.

Выявілася, што прычынай пажару стала банальная неасцярожнасць: вуглі з кадзіла выкінулі не ў металічнае вядро з вадой, а ў простую сметніцу, дзе былі паперы. Царква знаходзіцца ў памяшканьні, якое праваслаўныя вернікі перараблялі з крамы ў царкву пяць гадоў.

*Паводле: Ілона Іванова, zvyazda.minsk.by*

ГОРКІ

# Помоги, господи…

Ну никак не наладятся дела у Горецкого узла почтовой связи! Меняют-меняют там директоров, а толку (как говаривал дедушка Крылов) – нет.

И вот недавно придумали! Как рассказали работники этого учреждения, новое начальство решило, что все дело вовсе не в организации работы отделений связи (попробуйте на центральной почте, особенно в час пик, достояться в очереди на ксерокс, или дождаться, пока придут на счет положенные на мобильник деньги!).

Причиной производственных несчастий была объявлены, судя по всему, потусторонние силы. Как результат, на почту был приглашен священник, который и провел там некий православный обряд, после которого все барабашки должны были оттуда разбежаться, а выполнение плана обеспечиться само по себе.

Дай Бог, конечно, чтобы оно так и было. Но может, наряду со священнодействиями, руководство РУПС попыталось бы, например, увеличить число окошек хотя бы на центральной почте, чтобы сократить очереди. Ведь сейчас, как сказал один из посетителей, «зайдешь, посмотришь, махнешь рукой и пойдешь».

А может, «изгнав беса», почтовое начальство додумается до каких-то других улучшений в работе своего ведомства.

Помоги им в этом господи….

*Иван МОРОЗОВ*

БАБРУЙСК

## “СЯБАР” РЕАЛИЗУЕТ ПЯТЬ ИНВЕСТИЦИОННЫХ ПРОЕКТОВ ЗА СЧЕТ HEINEKEN

СЗАО “Пивоваренная компания “Сябар” в 2008 году планирует реализовать пять инвестиционных проектов по дальнейшей модернизации пивзавода в Бобруйске за счет финансирования их компанией Heineken.

“В текущем году планируется реализовать пять проектов для дальнейшего развития производства пивзавода в Бобруйске, крупнейшими из которых станут реконструкция варочного цеха и ввод в эксплуатацию новой линии розлива пива в ПЭТ-тару”, - проинформировали представители ПК “Сябар”. В варочном цехе установят оборудование германской компании Huppmann, сообщает Agrobel.by. А линию розлива приобретут у компании KHS.

В конце 2007 года Heineken объявила о покупке ПК “Сябар” путем поглощения ее материнской структуры - DBB Company. В настоящее время СЗАО “Пивоваренная компания “Сябар” является вторым по величине производителем пива в Белоруссии с долей рынка 11,9% по итогам января (по данным концерна “Белгоспищепром”). За январь 2008 года компания произвела 306 тыс.дал пива. Предприятие выпускает два сорта пива “Сябар” (“Самобытное” и “Светлое”) и четыре сорта пива марки “Бобров” (“Светлое”, “Крепкое” и “Классическое” и “Ice”). Продукция разливается в ПЭТ-бутылки емкостью 0,5 л, 1 л и 2 л и стеклянные бутылки емкостью 0,5 л.

*Источник: akcyz.com*

ЧЭРЫКАЎ

# Подпісы супраць АЭС

У вёсцы Верамейкі Чэрыкаўскага раёну мясцовыя актывісты Раман Раждзесьцьвенскі й Людміла Шарабурка пачалі зьбіраць подпісы супраць будаўніцтва атамнай электрастанцыі. За першыя два дні актывісты сабралі два дзясяткі подпісаў аднавяскоўцаў.

Раман Раждзесьцьвенскі й Людміла Шарабурка спадзяюцца, што да ініцыятывы далучацца іхныя калегі з усяго Чэрыкаўскага раёну.

“У нас няма задачы сабраць пэўную колькасьць подпісаў. Мы зыходзім з таго, што чым больш іх будзе, тым лепш. Для нас галоўнае — даць магчымасьць аднавяскоўцам выказаць сваё стаўленьне да меркаванага будаўніцтва АЭС у суседнім Слаўгарадзкім раёне. Людзям мы будзем тлумачыць, якую пагрозу нясе мірны атам”, — зазначыў “Свабодзе” Раман Раждзесьцьвенскі.

Тым часам у Горках актывісты антыядзернай групы сабралі тысячу трыста подпісаў супраць будаўніцтва АЭС у Горацкім раёне.

“Подпісы мы будзем зьбіраць, пакуль не дачакаемся якой-кольвек рэакцыі з боку дзяржавы. Пакуль на сабраныя подпісы адрэагаваў толькі старшыня Горацкага гарвыканкаму Міхаіл Анікееў: ён сказаў, што яны яму не патрэбныя”, — зазначае актывіст горацкай антыядзернай групы Эдуард Брокараў.

На Магілёўшчыне для будаўніцтва АЭС вызначаныя дзьве пляцоўкі: Кукшынаўская ў Горацкім раёне й Краснапалянская — у Слаўгарадзкім. Якую пляцоўку выберуць, пакуль невядома. Мяркуецца, што будаваць АЭС пачнуць у 2009 годзе.

*Радыё Свабода*

# Прыгавор без змяненняў

На мінулым тыдні ў Мінску прайшло паседжанне Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, на якім была зноў разгледжана самая гучная справа апошніх гадоў аб забойстве сям'і з шасці чалавек у вёсцы Вялікая Машчаніца Бялыніцкага раёна. Нагадаю, што 2 лістапада 2007 года свой прысуд абвясціла судовая калегія Магілёўскага абласнога суда., аднак бацька забітых дзяцей застаўся незадаволены тым, што забойцы ня знойдзены і падаў касацыйную скаргу ў Вярхоўны суд.

Крыху ўзнаўлю сутнасць справы, пра якую мы ўжо неаднаразова пісалі. У ноч з 31 траўня на 1 чэрвеня 2005 года ў вёсцы Вялікая Машчаніца адбылося зверскае забойства сям'і з шасці чалавек, якая літаральна перад гэтым пераехала ў вёску, набыўшы тут хату і прадаўшы кватэру ў Бялынічах. Раніцай былі знойдзены целы пенсіянеркі і яе сужыцеля, дачкі гаспадыні і маладога чалавека, а таксама - самае жудаснае – дваіх маленькіх дзяцей сямі і чатырох гадоў. На целах малых было знойдзена 14 і 19 розных цялесных пашкоджанняў. Уся вёска была ў шокавым стане, людзі знаходзіліся ў страху і разгубленасці, забойстваў у Машчаніцы не было з часоў мінулай вайны.

Праз дзень былі затрыманы шасцёра маладых жыхароў людзей ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў, усе яны з'яўляліся ўраджэнцамі вёскі Машчаніца. Пяцярым з іх неўзабаве было прад'яўлена абвінавачанне ў забойстве. Расследванне па справе цягнулася больш за год, а ў снежні 2006 года пачаўся судовы працэс у Магілёўскім абласным судзе пад старшынствам суддзі Міхаіла Мельнікава. Працэс завяршыўся толькі 2 лістапада 2007 года і праходзіў у закрытым рэжыме ў сувязі з тым, што ў час расследвання справы з'явіліся эпізоды, звязаныя з гвалтаўніцтвам і сэксуальнымі дачыненнямі з непоўнагадовымі.

Падчас разгляду справы было выклікана ў суд амаль паўтары сотні жыхароў Машчаніцы, было зроблена шмат розных экспертыз, сама справа налічвала 28 тамоў розных матэр'ялаў. У выніку судовага разгляду пракурор запатрабаваў для двух падазраваных выключную меру пакарання – растрэл, для іншых трох чалавек – пажыццёвае зняволенне.

Аднак калі 2 лістапада 2007 года судовая калегія Магілёўскага абласнога суда абвесціла свой прыгавор, то ў частцы абвінавачвання ў забойстве ў сувязі з недаказанасцю віны быў вынесены апраўдальны прысуд. Адзін з падсудных быў вызвалены з пад варты прама ў зале суда. Астатнія пакараны рознымі тэрмінамі зняволення ад 4 да 10 гадоў за іншыя злачынствы: некалькі чалавек прызнаны вінаватымі ў сэксуальных дачыненнях з непаўнагадовымі, крадзяжах, адзін прызнаны вінаватым у згвалтаванні.

І вось на мінулым тыдні адбылося паседжанне Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, які ў сваім рашэнні поўнасцю зацвердзіў прысуд Магілёўскага абласнога суда і маладыя людзі зноў прызнаны невінаватымі ў забойстве ў сувязі з недаказанасцю віны. Трое з іх у бліжэйшы час павінны выйсці на волю ў сувязі з тым, што яны адбылі большую частку тэрміну зняволення па іншым правапарушэнням і трапляюць пад закон аб амністыі.

Але застаецца без адказу самае галоўнае пытанне – хто забіў сям'ю і малых дзетак ў вёсцы Вялікая Машчаніца і чым займаецца наша міліцыя, калі яна вось ужо амаль тры гады ня можа раскрыць гэта зверскае злачынства? Жыхары вёскі баяцца выйсці на вуліцу, пра якія небудзь аўтарытэт супрацоўнікаў праваахоўных органаў сярод насельніцтва раёна лепш прамаўчаць... Я асабіста размаўляў з тым хлопцам, які быў затрыманы па падазоры ў забойстве, а затым вызвалены з пад варты ў зале суда яшчэ другога лістапада. Ён пакрысе прызвычваецца да жыцця на волі, пачаў працаваць у ААТ "Новая Друць". Тое, што ён кажа пра нашу міліцыю і мэтады яе працы, я паўтараць ня буду, але вы самі разумееце, шаноўныя чытачы, што патрэбна зрабіць з чалавекам, каб дабіцца прызнання ў забойстве, якое ён не здзяйсняў...

Будзем спадзявацца, што ў рэшце рэшт наша міліцыя зоймецца сваёй непасрэднай працай, а не кантролем за дзейнасцю законапаслухмянай апазіцыі і прыкладзе максімум намаганняў, каб знайсці забойцаў. Зарплату яны за гэта атрымліваюць (даволі добрую) своечасова і супрацоўнікаў для гэтай працы ў нашых праваахоўных органах больш чым дастаткова.

*Барыс ВЫРВІЧ*

## ЧУТКІ І ФАКТЫ

### СЛЕДСТВА ПА СПРАВЕ ІЛЬЯНАВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Як стала вядома рэдакцыі нашай газеты з дакладна інфармаваных крыніц, працягваецца следства па крымінальнай справе былога старшыні Бялыніцкага райвыканкама Аляксандра Ільянава.

У апошнія тыдні сярод жыхароў бялынiччыны папаўзлі чуткі, што быццам бы былы старшыня райвыканкама ўжо вызвалены з пад варты і знаходзіцца дома пад падпіскай аб нявыездзе. Магчыма, чуткі былі выкліканы тым, што, як кажуць супрацоўнікі райвыканкама, кіраўніцтвам райвыканкама быў падрыхтаваны ліст ў праваахоўныя органы нашай краіны з просьбай вызваліць ад адказнасці Аляксандра Ільянава ў сувязі з яго вялікімі заслугамі перад насельніцтвам Бялыніцкага раёна. Нібыта нават пад гэтым лістом ужо нават пачалі збіраць подпісы ўдзячных суграмадзян, але потым ініцыятыва знянацку перапынілася. Так гэта ці не, мы адназначна адказаць ня можам, аднак дакладна ведаем, што ўсе тыя людзі, якія прыйшлі на пасады з прызначэннем Ільянава старшынёй райвыканкама, засталіся на сваіх месцах і працягваюць кіраваць.

Сам жа Аляксандр Ільянаў па ранейшаму знаходзіцца ў следчым ізалятары і з пад варты яго ніхто вызваляць не збіраецца. Больш таго, як падцвердзіла нам інфармаваная крыніца з праваахоўных органаў, зараз вядзецца татальная праверка эканамічнай дзейнасці былога старшыні Бялыніцкага райвыканкама і ўжо быццам бы выяўлены шматлікія парушэнні.

Нарэшце, створана група з супрацоўнікаў розных праваахоўных ведамстў, якая зараз займаецца праверкай працы бялыніцкай міліцыі ў перыяд старшынства Ільянава. Той перыяд адметны тым, што на "суткі" за краты мог трапіць любы чалавек, які ў чымсьці не спадабаўся старшыні райвыканкама. Аснову групы складаюць афіцэры ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй з Мінска і Магілёва. Для працы ім выдзелены два пакоі на трэцім паверсе ў будынку міліцыі ў г. п. Бялынічы. Група працуе літаральна з ранку да вечара, пераглядаюцца ўсе адміністрацыйныя справы, якія выклікаюць падазрэнне ў парушэннях.

Наша газета абавязкова будзе адсочваць ход падзей і паведамляць аб іх развіцці сваім чытачам.

*Газэта "Паходня"*

# Магілёў: эфэктыўнасьць прадпрыемстваў праверацць ідэолягі

Магілёўскі гарвыканкам зьбіраецца ўлічваць у ацэнцы пасьпяховасьці прадпрыемстваў ня толькі эканамічныя паказьнікі, але й стан ідэалягічнай работы ў працоўных калектывах.

З такой ініцыятывай выступілі ідэолягі на адмысловай нарадзе гарвыканкаму, прысьвечанай эфэктыўнасьці праверак на прадпрыемствах. Чакаецца, што да канца сакавіка ідэолягі пададуць на разгляд гарвыканкаму ўжо сфармуляваныя крытэры такіх ацэнак.

Якімі будуць гэтыя крытэры? На гэтае пытаньне ў ідэолягаў гарвыканкаму пакуль няма канкрэтнага адказу. Яны аднак упэўненыя, што іх ініцыятыва гэта клопат пра людзей, таму найперш будуць улічвацца:

"Гэта й мікраклімат, які ў калектыве, адсутнасьць нейкіх хваляваньняў на прадпрыемстве. Колькасьць скаргаў і зваротаў. На колькі з імі канструктыўна й па дзелавому працуюць сёньня на прадпрыемстве, перадусім кіраўніцтва. На колькі кіраўнікі адчуваюць за сабой адказнасьць за пастаноўку ідэалягічнай работы ў арганізацыі. А адсюль выцякае ўсё", -- зазначае начальніца аддзелу ідэалягічнай работы гарвыканкаму Ала Галушка.

Пытаньне, ці павысіць ідэалягічнае спаборніцтва эканамічную эфэктыўнасьць прадпрыемстваў, засталося без адказу.

Паводле Алы Галушкі, да распрацоўкі крытэраў ацэнкі стану ідэалягічнай работы ў калектывах будуць далучаныя ідэолягі з саміх прадпрыемстваў.

Пры канцы мінулага году да паслугаў завадзкіх ідэолягаў у гарадзкой бібліятэцы імя Карла Маркса адкрылі інфармацыйна-ідэалягічны цэнтар. Пра ягоныя функцыі распавяла "Свабодзе" адна з супрацоўніц:

"Мы як ідэалягічны цэнтар дапамагаем і насельніцтву, але ў асноўным усё ж гэта ідэалягічны актыў. Людзі, якія на прадпрыемствах займаюцца на прадпрыемствах ідэалягічнай працай не заўжды могуць знайсьці патрэбную інфармацыю. Мы ім падбіраем літаратуру, каб яны ўжо на прадпрыемствах даводзілі яе свайму калектыву".

На стварэньне цэнтру з гарадзкога бюджэту было выдзелена васемнаццаць мільёнаў рублёў.

Ці патрэбны прадпрыемствам яшчэ й ідэалягічны кантроль. Вось меркаваньне магілёўскага палітыка, кіраўніка рэгіянальнай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі Уладзімера Шанцава:

"На прадпрыемства павінна працаваць тэхналягічная дысцыпліна, там павінна быць працоўная дысцыпліна, павінен быць эканамічны разьлік. А ідэалёгія на прадпрыемстве гэта безумоўна інструмэнт утрыманьня працоўнага калектыву ў страху. Каб яны ведалі сваё месца й ня ўлазілі ў дзяржаўныя справы".

***Радыё Свабода***

## «ПРЕССБОЛ» ЛИШИЛИ АККРЕДИТАЦИИ НА ОЛИМПИАДЕ-2008

Исполком НОК лишил сегодня спортивную газету "Прессбол" аккредитации на Олимпиаде-2008. Игры состоятся с 8 по 24 августа в столице Китая Пекине.

Выступавший на заседании исполкома НОК руководитель комиссии НОК по работе со средствами массовой информации Алексей Мирошниченко заявил, что газета стала "печатать публикации, оскорбляющие чувства олимпийских чемпионов и подрывающие деловую репутацию НОК". По его словам, публикацией, переполнившей чашу терпения, стала статья Светланы Парамыгиной "Олимпийская помойка. НИИследованный миллиард" в номере за 21 декабря 2007 года. Как сказал Алексей Мирошниченко, после нее многие олимпийские чемпионы и призеры Игр (Елена Белова, Дмитрий Довгаленок, Игорь Астапкович и другие) обратились с просьбой защитить честь и достоинство НОК. Для обсуждения ситуации собралась комиссия, которая составила и направила соответствующее письмо в Министерство информации, а также постановила вынести на заседание исполкома НОК вопрос о целесообразности аккредитации корреспондентов газеты "Прессбол" на Олимпиаде в Пекине.

По мнению первого вице-президента НОК Геннадия Алексеенко, многие публикации "Прессбола" носят тенденциозный характер и "никак не направлены на пропаганду олимпийских идеалов". "Мы не можем закрыть эту газету, но высказать свое отношение имеем право", - сказал Геннадий Алексеенко.

Члены исполкома НОК единогласно проголосовали за лишение "Прессбола", который является самым тиражным спортивным печатным изданием страны, олимпийской аккредитации. Освободившиеся вакансии (корреспондента и фотокорреспондента) были отданы "Народнай газеце" (журналист) и газете "Рэспубліка" (фотокор).

Как сообщалось ранее, печатным изданиям Беларуси выделено 10 олимпийских аккредитаций (6 пишущих журналистов плюс 4 фотокорреспондента). По одному пишущему журналисту отправят в Пекин газеты "Спортивная панорама", "Советская Белоруссия", "Рэспубліка", "Звязда", "Народная газета", а также Белорусское телеграфное агентство (БЕЛТА). По одному фотокорреспонденту делегируют на Игры "Спортивная панорама", "Советская Белоруссия", "Рэспубліка" и БЕЛТА.

Выбар №22 Люты 2008

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай рэкламы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.